Дзяржаўная установа культуры
«Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

Літаратурная спадчына Піншчыны



# *Настаўнік, паэт, грамадзянін...*

2016 г.

Я такі ўжо ёсць на свеце:
Што мне ліўні, што мне вецер,
Што мне снежныя віхуры -
Прагну я заўсёды буры,
Перуноў, маланак, грому,
Нетаптаных сцежак з дому,
Рэчак плынных, спеваў-граю,
Міру, шчасця свайму краю.

# 85-годдзю з дня нараджэння Алеся Бібіцкага прысвячаецца...

“Амаль сямсот машынапісных старонак. Вельмі шмат таго, што не увасобілася пры жыцці паэта ў друкавыныя радкі. Вершы, паэмы… Гэта ўсё паэтычная спадчына, якую пакінуў для нас Алесь Бібіцкі (1931 - 1998). Спадчына, прасякнутая вялікай любоўю да роднай зямлі, да непаўторнага Палескага краю, да палешукоў. Ад кожнага верша, ад кожнай паэмы вее непаўторным каларытам жыцця. Кожны радок - нібы промень, нібы струна, нібы клавіша гармоніка, на якую толькі націсні - і гармонік зайграе, ды так, што заспявае або засумуе душа.



І чым больш дакранаешся да ягоных радкоў, тым больш адчуваеш, як яны ускалыхваюць душу, і тым больш дзівуешся, як гучыць у іх музыка жыцця: кахання, шчасця і радасці, болі і страт, узнёсласці і пакут, мазолістых рук і духмянага хлеба…

“Вы толькі клікніце, і я адклікнуся...“.

Які ж ты вялікі - наш шаноўны Алесь Бібіцкі. У сваёй паэзіі ты быў такі глыбокі, такі імклівы і такі лагодны, як наша Прыпяць. Такім ты і застаўся.”

Мікалай Елянеўскі

# Старонкі біяграфіі



Алесь (Аляксадр Іванавіч) Бібіцкі нарадзіўся 13 жніўня 1931 года ў вёсцы Вербавічы Нараўлянскага раёна. Бацька працаваў кавалём, маці ў паляводчай брыгадзе. Да вайны скончыў тры класы, прадоўжыў вучобу ўжо пасля вызвалення родных мясцін.

Паэт у дзяцінстве і юнацтве, як і любы сялянскі хлопец, у поўнай меры спазнаў і нялёгкую вясковую працу і вясковую паэзію, якая на ўсё жыццё запаланіла чулае юнацкае сэрца сваім сціплым, затое сапраўдным харaством.

Пасля заканчэння дзесяцігодкі ў 1950 годзе Алесь Бібіцкі паступіў у Мазырскі настаўніцкі інстытут. Завочна скончыў філалагічны факультэт Брэсцкага педагагічнага іcтытута.

У 1952 годзе Алесь Іванавіч Бібіцкі па ўласным жаданні быў накіраваны на настаўніцкую працу на Піншчыну. Спачатку працаваў у Лапацінскай сямігодцы, а з лета 1954 года быў празначаны дырэктарам Плошчаўскай школы, дзе працаваў каля 40 год да самага закрыцця школы. На пенсіі прадоўжыў працоўны шлях настаўнікам Калавураўвіцкай сярэдняй школы.

Неаднойчы Аляксандр Іванавіч абіраўся дэпутатам сельскага Савета. Быў абраны вяскоўцамі старастам вёскі Плошчава. У 1998 годзе стаў членам Саюза пісьменнікаў Беларусі. Шмат год кіраваў літратурным аб’яднаннем “Арбіта” пры газеце “Палеская праўда”.

10 кастрычніка 1998 года Алесь Бібіцкі пайшоў з жыцця.

# З чаго пачынаецца

З матчынай песні вядома, ад бацькоўскага парога, з маленства, з тое рабіны, што расла  ля вакон  роднай хаты.

Свой першы верш “Вясна” Алесь Бібіцкі напісаў будучы вучнем  сёмага класа і з той  пары паэзія стала нязменай  спадарожніцай яго жыцця.  Першы верш Алеся Бібіцкага быў надрукаваны  ў “Палескай праўдзе” у 1953 годзе. У 1955 годзе вершы палескага паэта былі надрукаваны  у часопісе  “Маладосць”.

Гоман рачных хваль, музыка птушыных спеваў, несціханы шум бору: гэтыя галасы беларускай прыроды чароўнымі мелодыямі гучалі ў душы паэта, выліваючыся ў цудадзейныя вершы.

*Услухваючыся ў  музыку вясны,*
*У гэтыя жывыя гукі-зыкі,*
*І мне здаецца: на канцэрт лясны,*
*З усіх куткоў сабраліся музыкі.*
*Дразды на флейтах аж люляюць гай,*
*Лось на кларнеце  выцінае скерца,*
*І салаўёў на скрыпках шчыры грай*
*Плыве санатай у душу і ў сэрца.*
*Чмялі на арфах  арыі фінал*
*Выводзяць мройна ў кветках пры дарозе,*
*Як барабаншчык—прафесіянал,*
*Дроб выбівае дзяцел на бярозе.*
*Свістулек розных нават не злічыць*
*Ад іх ажно звініць навокал веце.*
*Праз увесь дзень лясны канцэрт гучыць,*
*Як гімн жыццю на гэтым белым свеце.*

Радзіма… яе гісторыя, яе паданні. Яе маляўнічыя краявіды, яе радасць і боль, яе народ, шчырыя і сумленныя людзі-працаўнікі, палешукі-руплiўцы. Усё гэта неаддзелена ад свету інтарэсаў паэта, ад яго роздумаў, радасцей, трывог, захаплення роднай зямлёй.

Алесь Бібіцкі бязмежна любіў Палессе. Аб пыгажосці Палесся пісана-перапісана. І ўсё ж паэт знаходзіць нейкія новыя словы, цікавыя, запамінаючыя вобразы. Каб перадаць сваё захапленне непаўторнасцю роднага краю, сваю любоў да яго.

У родным краі для паэта ўсё поўна вялікага сэнсу. Толькі паэт з вось такой любоўю до роднай зямлі можа быць першаадкрывальнікам яе сапраўднага хараства. Родныя краявіды глыбока хвалююць паэта, ім аддадзена частка яго сэрца, куточак самай патаемнай і шчырай любові.



На Піншчыне, дзе леты ёсць і зімы,
Дзе тчэ вясна зялёныя кілімы,
А восень паліць стылыя пажары ,
Само быццё - крыніца светлай мары.

Менавіта на Піншчыне ў поўнай меры раскрыўся паэтычны талент Алеся Бібіцкага. У 1979 годзе свет пабачыў першы зборнік паэта «Зоры над Пінай», у 1994 годзе з друку выйшаў зборнік для дзяцей “Міхаськава гара”, які ўключаны ў калектыўню кніжку “Дзе начуе апетыт”. Адзін з аўтараў трох калектыўных зборнікаў. Друкаваўся Алесь Бібіцкі ў “Днях паэзіі”, часопісе “Маладосць”, “Вясёлка”, “Літаратура і мастацтва”...



Вершы, сабраныя ў кнізе “Зоры над Пінай” адрасаваны рупліўцам—палешукам, родным краявідам. Тут няма выпадковых вершаў. Усе яны напісаны на адным дыханні: глыбокія, прачулыя, выверанyя, свежыя на думку і вобраз, па-сапраўднаму народныя… Усе вершы прыцягваюць натуральнай інтанацыяй, народнай мовай, добрым густам, глыбокім зместам і падтэкстам. Паэт сімпатызуе простым людзям, бачыць у іх сваіх сяброў. І ў кожным вершы прысутнічае пачуццё Радзімы.






***Гучна ў сцену***
***Б’юцца хвалі***
***Бы ў Венецыі якой,***
***Акуні, ляшчы пасталі -***
***Самі просяцца ў пакой.***
***У вадзе па пояс дрэвы,***
***Каля хат стаяць чаўны -***
***Мора справа - мора злева***
***На Пелессі ў час вясны.***
***Прыпяць разлілася ўчора***
***На прыціхлай старане,***
***Калі хто не бачыў мора-***
***Калі ласка да мяне.***




У слове патрэбу маю,
Як у высокім небе
Да самага скону, знаю,
гэтай расці патрэбе.

У слове патрэбу маю,
нібы зярнятка у глебе.
Пакуль пяро трымаю –
Гэтай расці патрэбе.

У слове патрэбу маю,
Так як у жытнім хлебе.
ля песні роднаму краю –
Гэтай расці патрэбе.

Кожны хто прачытае вершы і паэмы з кнігі, лёгка пераканаецца, што аўтар да замілавання ў сэрцы любіць родны беларускі народ, нашу прыроду, вёску, птушак – усё існае на дарагой ўсім нам зямлі. У кнізе паэзіі прываблівае нестандартны паказ характараў герояў, мноства трапных адметных метафар і паэтычных знаходак.

У рэцэнзіі на вершы Алеся Бібіцкага С. Гаўрусёў даў  характарыстыку яго творчасці: “Ёсць нешта прывабнае ў самой постаці вясковага настаўніка-паэта. Згадваюцца многія: але ў першую чаргу манументальная асоба Якуба Коласа, узнёсла-рамантычны Пімен Панчанка… Да гэтай плеяды  можна залічыць і Алеся Бібіцкага, які жыве і настаўнічае ў вёсцы. Як і слаўныя яго папярэднікі, ён набліжэй да калыскі нашай песні – роднай зямлі”

Мой стол пісьмовы –
Луг муровы
Ды бераг Ясельды пусты,
Дзе долу
Росы асцярожна
Раняюць раніцай кусты,
Тут не спяваць
Ніхто не зможа,
Тут не маўчацца салаўю,
Мясціне
Казачнай прыгожай
Сваю даніну аддаю.-

*піша А.Бібіцкі ў вершы “Мой стол”*


МАРА
Мара прагу да жыцця —
Заўжды народзіць,
За сабой нас —
Хай ляціць яна да зорак
З роднай хаты
Ды заўсёды будзе светлай,
І крылатай.
ЗАНАЧУЕМ
Заначуем там,
дзе ноч застане,--
Алесь Бібіцкі
Мне зычыў птах...
Зоры над Шчарай
ДЗЕ НАЧУЕ АПЕТЫТ
Алесь Бібіцкі
ПЕРШЫ СТАРТ
Алесь Бібіцкі
СІНІЯ БОМЫ

# А табе я пакіну, мама, толькі ласку сваю



**Маці паэта -**
**Варвара Паўлаўна**

Многа цудоўных радкоў, поўных любові і ласкі прысвяціў Алесь Бібіцкі маці. Пяшчотаю і пашанаю, нялёгкім одумам запоўнены вершы пра маці. У іх самае роднае, святое і запаветнае, што ёсць ў чалавека.

## *Вочы маці*

Не кожны год, не кожны злепак-дзень,
Тым болей міг - у памяці навечна.
Хаця ж усё над намі, нібы цень,
Вісіць заўсёды неяк недарэчна.

Забыць мы можам непаўторны час
У паўсядзённых клопатах-турботах.
Само жыццё пазначана для нас
У шматпакутных вечных паваротах.

То пад гару, а то - ляцім з гары
У недаробку-калымазе быту…
Ды вочы маці, нібы дзве зары,
Глядзяць на нас і бачаць нас з нябыту.

# Хоцьдаўно над краінай адгрымела вайна...

## Памяць

*На узлеску ў час лета*
*І заўжды ў гэты дзень*
*Плача ў горы кабета,*
*Ходзіць нібыта цень*

*Кліча любага сына,*
*Як зязюлька, яна,*
*Хоць даўно над краінай*
*Адгрымела вайна.*

*Ён загінуў. Не здаўся*
*У няроўным баі,*
*Ды навечна застаўся*
*Паміж намі ў страі.*



**Аляксандр Бібіцкі ў арміі, 1951 г.**

Памяць часта вяртае паэта ў дзяцінства, апаленае вайною. Бацька паэта загінуў на фронце. Вайна стала балючай памяццю многіх твораў Алеся Бібіцкага, яго трывожным роздумам. Яна не хоча апусціць ад сябе, пакінуўшы ў яго душы незабыўны на ўсё жыццё, на ўвесь чалавечы век, суровы і грозны след.

# Плёс

*жонцы Тоні*

*Звёў мяне з табою лёс,*
*Калі верыць можна ў гэта,-*
*І зацвіў асенні плёс*
*Шматкалёрна, нібы летам.*

*На пажухлыя кусты*
*Я глядзеў, як на вяргіні.*
*Свет здаваўся мне пусты*
*Без цябе, маёй багіні.*

*Як я днямі сумаваў*
*Па табе! Душу трывозе*
*Без развагі аддаваў,*
*Сэрца білася ў знямозе.*



**Аляксандр Іванавіч разам са сваёй жонкай Антанінай Маркаўнай (таксама настаўніцай) выгадаваў траіх дзетак: сына Алеся і дочак Ларысу, і Людзмілу.**



*Да сустрэчы сотні дум*
*Галаву маю кружыла,*
*Грудзі грыз няўмольны сум.*
*А ці ты па мне тужыла?*

*Кажаш-так, наш-шчасны лёс,*
*Без вагання веру ў гэта.*
*Шматкалёрна, нібы летам,*
*Век цвіці, наш стрэчны плёс.*



**Хата А. Бібіцкага стаіць у некалькіх кроках ад Прыпяці, ля шлюза**




**Экспазіцыя музея Калавуравіцкай яслі-сад-сярэдняй школы**





У Калавуравіцкай школе, дзе працаваў апошнія гады Алесь Бібіцкі ёсць школьны музей. Там мясцовыя рупліўцы сабралі тое-сёе, што датычылася жыцця і працы Бібіцкага. Атрымался экспазіцыя, да якой цягнуцца вучні і, проста, наведвальнікі, заглянуўшыя ў школу.











**Фото з экспазіцыі музея**









**Расце каля Калавурвіцкай школы алея, якую пасадзіў Алесь Іванавіч Бібіцкі. Яе так і называюць настаўнікі і вучні - алея Бібіцкага.**



Супрацоўнікі Пінскай ЦРБ імя Я. Янішчыц на базе Каллавуравіцкай сярэдняй школы, дзе апошнія гады свайго жыцця працаваў Алесь Бібіцкі, арганізавалі свята паэзіі “Ва мне пачуццяў плешча мора…”, прысвечанае 80-годдзю з дня нараджэння паэта. Удзельнікі мерапрыемства змаглі акунуцца ў чароўны свет паэзіі. Супрацоўнікі Пінскай раённай бібліятэкі расказалі пра жыццевы і творчы шлях паэта, а таксама падрыхтавалі электронную прэзентацыю і буклет, прысвечаны Алесю Бібіцкаму.




Сваімі ўспамінамі пра паэта падзяліліся старшыня Калавуравіцкага райвыканкама У. У. Наўныка, дырэктар мясцовай школы Я. М. Вакуліч. На свята завіталі і госці: пісьменнік М. В. Елянеўскі, былы настаўнік Плошчаўскай школы У. Г. Зенюціч, навуковы супрацоўнік Лапацінскай бібліятэкі-музея А. Блока М. П. Жукаў і маладая паэтэса Марыя Кобец. Закончылася мерапрыемства экскурсіяй па краязнаўчаму музею, якую правялі для гасцей школьнікі. (Полесская правда. - 2011. - 23 лістапада).



У актавай зале цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Яўгеніі Янішчыц да 80-годдзя з дня нараджэння А. Бібіцкага прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя "Ва мне пачуццяў плешча мора…"

# Нават у хадзе я любуюся наваколлем

Гутарка Алеся Бібіцкага з вучаніцамі Калавуравіцкай
СШ Хоміч Вольгай і Фянюк Таццянай, 1996 г.

## Калі і дзе нарадзіліся?

Калі спасылацца на дакументы, дык нарадзіўся аж тры разы: па метрыках-13 жніўня 1931 года, па архіўнай кнізе Вербавіцкага С/Савета-1930 год, па пашпарту – 10 лістапада 1931 года. Што тычыцца года, дык больш справядлівы 1930 год. Аб дні народзін ёсць версія, што нарадзіўся на рэлігійнае свята, якое святкавалася ў нашай вёсцы. Гэта - Юрый. Маці казала, што ўсе сельскагаспадарчыя работы ў гэты час былі скончаны. Згодна гэтай версіі дзень народзін -10 лістапада.

## У якой сям'і нарадзіліся? Хто з сямейнікаў аказаў на Вас асаблівы ўплыў? Прыгадайце факты.

Нарадзіўся ў сям'і калгаснікаў. Бацька працаваў кавалём, а маці - паляводам. Значны ўплыў на фарміраванне майго характару зрабіла маці. Ад яе я пераняў рысы сціпласці, ціхмянасці, роздуму. Хоць яна была неграматнай, але ад мяне патрабавала, каб вучыўся добра. Ад бацькі пераняў працавітасць: любая справа, як кажуць, мне па плячы. Акрамя мужчынскіх работ нядрэнна валодаў ткацтвам, вышываннем, вязаннем, шыццём.

## Дзе вучыліся? Ці былі спрыяльныя ўмовы для развіцця літаратурных здольнасцей? Калі былі, то якія?

Да ВАВ скончыў 3 классы. У час вайны пайшоў працягваць вучобу, але хутка быў падвергнуты штрафу за тое, што не замаляваў ці не склеіў у кнізе два лісты з партрэтамі Леніна і Сталіна. Бацька ледзь выратаваўся з гэтай бяды. Дапамог стараста, які быў звязаны з партызанамі, а ў партызанах (у кіраўніцтве) была і бацькава радня. Пасля гэтага здарння школу пакінуў і толькі пасля вайны пайшоў у 4 класс. У роднай вёсцы скончыў 7 класаў і паступіў у Мазырскае педвучылішча. Правучыўся там больш двух месяцаў і па прычыне матэрыяльных цяжкасцей пакінуў. Пайшоў вучыцца ў 8 класс Галоўчыцкай СШ, якую скончыў у 1950 годзе. У гэтым жа годзе паступіў ў Мазырскі настаўніцкі інстытут. У 1952 годзе пасля заканчэння інстытута па ўласным жаданні быў накіраваны на працу настаўніка на Піншчыну. З 1954 года і да акрыцця школы працаваў дырэктарам Плошчаўскай школы.

## Чаму Вы сталі паэтам?

Паэтам стаў, бо мабыць, атрымаў гэты дар ў спадчыну. Адна з маіх прабабак была вострая на язык, нават, як кажуць, магла на ходу скласці песню. Напэўна ад яе штосьці перайшло і да мяне, а яшчэ мой бацька ў дзяцінстве чытаў мне шмат казак, асабліва паэтычных. Сам я вельмі люблю дэкламаваць вершы са сцэны. Пазней (у настаўніцкім інстытуце) дэкламаваў і свае.

## Як Вы прыйшлі ў літаратуру? Дзе і калі надрукавалі свае першыя вершы?

Я ўжо ў школе спрабаваў пісаць свае вершы, але належнай увагі з боку настаўнікаў не адчываў. Некаторыя вершы змяшчаліся ў насценнай газеце. Працягваў пісаць і ў настаўніцкім інстытуце. Быў рэдактарам факультэцкай газеты, у якой часта змяшчаў свае вершы. У друк не пасылаў. І толькі тады, калі прыехаў на Піншчыну, пачаў дасылаць свае вершы не толькі ў мясцовую газету, але і ў рэспубліканскія газеты і часопісы. Першы мой верш быў надрукаваны ў "Палескай праўдзе" ў 1953 годзе. У 1955 годзе ўпершыню мае вершы былі надрукаваны ў часопісе "Маладосць". У 1979 годзе выдаў зборнік "Зоры на Пінай". З'яўляўся адным з многіх аўтараў кніг "Дзень паэзіі", а таксама калектыўнай кнігі "Гары, агонь Кастрычніка".

## Хто з пісьменнікаў аказаў на Вас найбольшы ўплыў?

Асноўны ўплыў на мяне зрабілі якуб Колас і Янка Купала. Традыцыйнасці пісьма я прытрымліваюся і цяпер. Нездарма ў рэцэнзіі на зборнік "Сінія бомы" С. Гаўрусёў пісаў: "Ёсць нешта прывабнае ў самой постаці вясковага настаўніка-паэта. Згадваюцца многія: але ў першую чаргу - манументальная асоба Якуба Коласа, узнёсла-рамантычны Пімен Панчанка...Да гэтай плеяды можна залічыць і Алеся Бібіцкага. Які жыве і настаўнічае ў вёсцы."

**Кажуць,што родны кут - невычарпальная крыніца паэзіі. Ці падзяляеце Вы гэтую думку?**

Роднаму кутку я прысвяціў немала вершаў. Ён мяне натхняе, акрыляе. Нават у хадзе я любуюся наваколлем. На працу ў Калавуравіцкую школу хаджу пешкі за 7 кіламетраў. І за гэты час я напісаў вершаў на тры паэтычныя кніжкі. Дзвюм з іх назва дадзена: “Цяжкія барозны” і “Вожык”, а над трэцяй кнігай яшчэ думаю.

**Як, на Вашу думку, палепшыць літаратурную адукацыю вучняў?**

Я перакананы ў тым, ўто ўсё залежыць ад настаўніка. Ён можа па-за праграмай прывіваць вучням любоў да літаратуры, паэтычнага слова, знаёміць дзяцей з набыткамі сучаснай літаратуры. І гэта нічуць не пашкодзіць засваенню праграмнага матэрыялу. У сваёй настаўніцкай працы я гэта практыкаваў амаль на кожным уроку. Гэта дапамагае вучням пашырыць свае веды, прывівае любоў да сучаснай паэзіі.



**Прыпяць ля вёскі Плошчава**



**Алесь Бібіцкі быў ініцыятарам правядзення свята паэзіі “Янішчыцкі лістапад”**

# Матэрыялы аб паэце


1. Бібіцкі, А. Некралог // Заря. - 1998. - 17 октября.
2. Бібіцкі, А. Паэтычныя галасы Брэстчыны: бібіліяграф. паказальнік. – Брэст, 1991. - С. 8-10.
3. Бібіцкі, А. Зоры над Пінай: Вершы. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1979. - 94 с.
4. Бібіцкі Алесь (Аляксандр Іванавіч) прыняты ў Саюз беларускіх пісьменнікаў // ЛіМ. - 1998. - № 14.- С. 4.
5. Ва мне пачуццяў плешча мора…: Алесю Бібіцкаму - 65 // Полесская правда. - 1996. - 17 августа.
6. Елянеўскі, М. "Табе, хто пачынае жыць…" : Алесь Бібіцкі // Полесская правда. - 2011. - 3 сентября.
7. Колесник, В. Тип сельского поэта…[Алесь Бибицкий] // Заря. - 1974. - 3 августа.
8. Памяці Алеся Бібіцкага // Пінскі веснік. - 1998. - 13 кастрычніка.
9. Сульдина, М. Первая борозда: [Алесь Бибицкий] // Знамя юности. - 1980. - 5 февраля.
10. Умер Алесь Бибицкий: Прощай, учитель, поэт, гражданин…// Полесская правда. - 1998. - 14 октября.
11. Федорович, В. Любовь и память: заседание методобъединения педагогов Каллоуровичской СШ, посвящённое памяти Алеся Ивановича Бибицкого // Полесская правда. - 2005. - 23 апреля.
12. Шапиро, С. Площево – деревенька дальняя: [житель деревни, сельский староста, член Союза писателей РБ – Александр Иванович Бибицкий] // Заря. - 1998. - 14 июля.
13. Шушко, А. Мне зычыў птах: аб А. Бібіцкім // Полесская правда. - 2005. - 31 декабря.
14. Шчодрасць душы – ў шчырасці: Алесь Іванавіч Бібіцкі // Пінскі веснік. - 1998. - 24 сакавіка.
15. Яскович, В. Полесские мотивы: [Алесь Бибицкий] // Заря. - 1979. - 7 декабря.

# Я абавязаны табе

Я абавязаны табе
За светлы ранак,
Дзень пагодны,
За хор птушыны,
Сэрцу родны,
Я абавязаны табе.

Я абавязаны табе
За хлеб духмяны,
Наздрваты.
За нашы будні і за святы
Я абавяны табе.

Я абавязаны табе
За шчыры смех
Дзяцей ў хаце
За ўсё,
за ўсё
Радзіма-маці,
Я абавязаны табе.

*Алесь Бібіцкі*

225 710

г. Пінск, вул. ІПД, 35

тэл. 31 60 15
факс 31 61 36
эл. адрас: crbpinsk@tut.by

Адказны за выпуск А. І. Анташук